УДК 94(476):331.108

# КАДРЫ І ЯКАСЦЬ ХЛЕБАПРАДУКТАЎ У АПОШНЯЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСІ

**Пушкін І. А.**
**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій**
**г. Магілёў, Беларусь**

У 1970–1980-я гг. павялічвалася колькасць гарадскога насельніцтва Беларусі, дынамічна і паспяхова развівалася прамысловасць. Апераджальнымі тэмпамі развіваліся хімічная і нафтахімічная прамысловасць, машынабудаванне і металаапрацоўка. У той жа час марудна развіваліся галіны прамысловасці, якія выраблялі тавары шырокага ўжытку. Не вырашаліся праблемы дэфіцыту, рытмічнага забеспячэння насельніцтва харчовымі і спажывецкімі таварамі, якасці прадукцыі.

Стабільна і рэгулярна адчуваўся недахоп хлебабулачнай прадукцыі ў крамах Магілёва, Оршы, Барані і іншых гарадоў і раёнаў БССР. У 1980 г. на сесіі Магілёўскага абласнога савета прагучала, што ў шэрагу крам не заўжды быў у продажы хлеб, прадпрыемствы “Магілёўхлебпрама” недастаткова выпякалі розных кандытарскіх вырабаў, пастаўлялі ў гандлёвую сетку хлебабулачную прадукцыю нізкай якасці. Толькі ў першым паўгоддзі 1980 г. прадпрыемствы гандлю г. Магілёва забракавалі і вярнулі хлебазаводам 23,9 т хлебабулачных вырабаў [1, с. 152–154].

У 1980-я гг. у БССР налічвалася 60 заводаў Міністэрства хлебапрадуктаў БССР, 166 прадпрыемстваў сістэмы Белкаапсаюза і 9 упраўлення рабочага забеспячэння Беларускай чыгункі. У 1986 г. яны выпрацавалі 1 млн. 576 тыс. тон розных вырабаў (у сярэднім на кожнага жыхара – па 157 кг.) больш за 200 найменняў [2, арк. 24].

Пры гэтым мелі месца факты выпечкі хлебабулачнай прадукцыі з надрывамі і расколінамі, дэфармацыяй і падгарэласцю боханаў хлеба, нераўнамернай сітаватасцю. У 1986 г. было забракавана 148 тон вырабаў ці 7,2% ад праверанай колькасці прадукцыі. Да прадпрыемстваў прымянілі 33 эканамічныя санкцыі. Найбольш парушэнняў дапускалася на прадпрыемствах Брэсцкай і Магілёўскай абласцей. У аб’яднанні “Брэстхлебпрам” вытворчы брак павялічыўся ў першым квартале 1987 г. у параўнанні з першым кварталам 1986 г. у 1,5 разы. На дзяржаўных прадпрыемствах Магілёўскай вобласці ў студзені – сакавіку 1987 г. забракавалі 25,4% абследаванай прадукцыі, у сістэме спажыўкааперацыі – 14%. Парушалася перыядычнасць дастаўкі хлебапрадуктаў. У мясцовыя органы ўлады і сродкі масавай інфармацыі толькі за першы квартал 1987 г. паступіла 13 тыс. лістоў і зваротаў з прэтэнзіямі да якасці хлеба і яго асартыменту [2, арк. 26, 28].

Кіраўніцтва Савецкай Беларусі лічыла, што кіраўнікамі і спецыялістамі хлебапякарнай прамысловасці не прымаліся належныя меры па скарачэнні да мінімуму шматлікіх парушэнняў тэхналагічнай дысцыпліны, прастояў абсталявання, сістэматычнаму правядзенню планава-папераджальных рамонтаў. Недахоп сыравіны, выкарыстанне фізічна зношанага і маральна састарэлага абсталявання не дазвалялі наладзіць стабільную вытворчасць якасных хлебабулачных вырабаў. На гэта таксама ўплывала вялікая цякучасць кадраў, на пэўных камбінатах хлебапрадуктаў яна складала ў 1984 г. да 45% [3, арк. 170–172, 178].

Міністэрствам хлебапрадуктаў БССР, Белкаапсаюзам, Мінгандлем БССР, выканкамамі абласных, гарадскіх і раённых саветаў праводзілася пэўная работа па паляпшэнні якасці хлебабулачных і макаронных вырабаў. Былі зацверджаны новыя

стандарты, праведзены выпрабавальныя выпечкі новых відаў хлеба, перагледжаны і зацверджаны нормы выхадаў на хлебабулачныя вырабы, уключаючы палепшаныя гатункі. Згодна з дзяржстандартам 26987-86 маса хлеба павінна была быць 0,5–1,2 кг. Канкрэтную масу хлеба ва ўказаных межах устанаўлівала Міністэрства хлебапрадуктаў саюзнай рэспублікі па ўзгадненню з Міністэрствам гандлю з улікам неабходнасці ўстанаўлення рознічных цэн на хлеб, кратных 2 і 4.

У мэтах выраўноўвання кошту новых, больш дарагіх, і выпрацоўваемых раней хлябоў па прапанове Мінхлебапрадукта БССР зацвердзілі цэны на паменшаныя масы "дарніцкага", "сталічнага" і "пшанічнага" гатункаў. Іх выпуск прамысловасць пачала ў студзені 1987 г. Агульная вытворчасць хлеба, у асноўным за кошт памяншэння яго масы, за першы квартал 1987 г. скарацілася на 7,2% або на 23,5 тыс. тон. Нягледзячы на гэта, толькі прадпрыемствы Мінхлебапрадукта БССР атрымалі 6,9 млн. руб. прыбытку супраць 4,7 млн. за першы квартал 1986 г. Для паляпшэння спажывецкіх уласцівасцяў хлебных вырабаў, запаволення працэсу чэрствання шырока ўжываліся разнастайныя дабаўкі – паляпшальнікі і абагачальнікі ("улучшители и обогатители"). Удзельная вага такой прадукцыі ў агульным аб'ёме вытворчасці на прадпрыемствах Мінхлебпрама БССР складала 84,5 %, Белкаапсаюза 43 % [2, арк. 24–25].

У хлебапякарнай прамысловасці Беларусі перагледзелі тэхналогію прыгатавання вадкіх жытніх заквасак і цеста, месцамі зрабілі капітальны рамонт і замену старых печаў, прафілактычны рамонт дазіровачнага абсталявання. Правялі атэстацыю кіруючых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і спецыялістаў [4, арк. 22–23]. Ажыццяўлялі пераход на аплату працы працоўных, ІТР і служачых па новых тарыфных стаўках і службовых акладах. Праводзілася ўвязка памераў прэміравання з якасцю прадукцыі, яе асартыментам, наяўнасцю прэтэнзій і рэкламацый. Тым не менш, праблемы асартыменту і якасці прадукцыі не здолелі вырашыць канчаткова.

Такім чынам, для апошняга дзесяцігоддзя савецкай мадэрнізацыі Беларусі былі ўласцівы шматлікія недахопы ў арганізацыі забеспячэння насельніцтва якаснымі хлебапрадуктамі і нізкая культура абслугоўвання. Існаваўшая сістэма планавання і размеркавання не спрыяла вырашэнню праблем. Спробы выправіць становішча шляхам змяняльнасці кадраў, павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы не прыносілі чаканага выніку. У кіраўнікоў і спецыялістаў не існавала магчымасцяў для самастойнай дзейнасці, творчыя памкненні кадраў скоўваліся жорсткімі рамкамі адміністрацыйнай распарадчасці і кантролю, не забяспечвалася неабходная ступень эканамічнай свабоды, дапушчальнай рызыкі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : БДУТ, 2022. – 302 с.

2. Записка КНК БССР «О результатах проверки обеспечения качества хлеба и хлебобулочных изделий в хлебопекарной отрасли Белорусской ССР» от 15.04.1987 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). – Ф. 9. Воп. 184. Спр. 58.

3. Справка об итогах выполнения плана экономического и социального развития города Орши за 1984 год // Занальны дзяржаўны архіў г. Орша. – Ф. 27. Воп. 4. Спр. 985.

4. Справка отдела сельского хозяйства и пищевой промышленности Могилевского ОК КПБ от 25.06.1987 г. о проделанной работе по улучшению качества хлеба и хлебобулочной продукции // ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 184. Спр. 58.